**Юнакі і дзяўчаты! Настойліва авалодвайце марксісцка-ленінскім вучэннем, дасягненнямі навукі, тэхнікі і культуры! Памнажайце слаўныя рэвалюцыйныя, баявыя і працоўныя традыцыі савецкага народа! Будзьце ў першых радах барацьбітоў за паспяховае выкананне рашэнняў XXV з'езда КПСС!**

(З Заклікаў ЦК КПСС да 59-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі).

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 28 (1140) ● 21 кастрычніка 1976 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

## ПРАБЛЕМЫ НАВУКОВАЙ ІНФАРМАЦЫІ

**Адбылося пасяджэнне вучонага савета аддзела навуковай інфармацыі па грамадскіх навуках АН БССР з удзелам супрацоўнікаў службы навукова-тэхнічнай інфармацыі нашага універсітэта.**

**З дакладам «Праблемы навуковай інфармацыі ў святле рашэнняў XXV з'езда КПСС» выступіў начальнік цэнтра навукова-тэхнічнай інфармацыі БДУ С. Паваляеў. Гаворка ішла пра ўдасканаленне форм і метадаў інфармацыйнай работы ў галіне грамадскіх навук.**

## УСЕСАЮЗНАЯ НАРАДА

**Ва універсітэце закончылася навукова-тэхнічная нарада па тэрмадынаміцы металічных сплаваў. Яе правялі міністэрствы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і БССР, секцыя па тэрмадынаміцы металічных сплаваў навуковага савета па тэрмадынаміцы і тэрмахіміі АН СССР і наш універсітэт.**

## ПРАЦУЕ ШКОЛА МАЛАДЫХ ВУЧОНЫХ

**Ужо каля 10 гадоў у ВНУ рэспублікі працуюць саветы маладых вучоных. Каб прааналізаваць дзейнасць саветаў за апошні час, абагульніць вынікі, абмяняцца вопытам работы саветаў ВНУ, 19 кастрычніка пачала сваю работу першая школа маладых вучоных БДУ імя У. І. Леніна «Праблемы арганізацыі і працы саветаў маладых вучоных вышэйшых навучальных устаноў». У рабоце школы прынялі ўдзел прадстаўнікі ВНУ, НДІ г. Мінска, Казанскага дзяржаўнага універсітэта, Мазырскага, Магілёўскага педінстытутаў.**

**З уступным словам на пленарным пасяджэнні выступіў в. а. прарэктара па навуковай рабоце А. Чалей. Ён падкрэсліў, што школа маладых вучоных неабходна для большай актывізацыі дзейнасці саветаў, для планавання работы маладых вучоных універсітэта, ВНУ рэспублікі. Аб выніках навуковых даследаванняў за дзевятую пяцігодку, аб праблемах, якія стаяць перад маладымі вучонымі, аб недахопах і задачах на пасяджэнні выступілі загадчыца сектара па рабоце з навуковай моладдзю ЦК ЛКСМБ Л. Белая і В. Урыўскі, начальнік навукова-арганізацыйнага аддзела Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР.**

**Пасля пасяджэння работа школы маладых вучоных праходзіла па трох спецыяльных секцыях: «Формы і метады работы саветаў маладых вучоных вышэйшых навучальных устаноў», «Роля саветаў маладых вучоных у камуністычным выхаванні студэнцкай і навуковай моладзі», «Роля саветаў маладых вучоных ва ўкараненні вынікаў навукі ВНУ ў народную гаспадарку».**

## ДАВЕР'Е І ПАТРАБАВАЛЬНАСЦЬ

### ЯК Я ПРАЦАВАЎ СА СТУДЭНТАМІ І КУРСА Ў 1975-76 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ

Пасля заканчэння дзесяці класаў былыя школьнікі не ўмеюць пісаць канспектаў, а таму ва універсітэце ім здаецца ўсё новым: запісы лекцый, афармленне задач на практычных занятках і правядзенне лабараторных. Калі яшчэ ўлічыць неглыбокія, а часам адрывачныя веды галоўных навук у многіх першакурснікаў, то перад выкладчыкамі, якія вядуць заняткі з імі, стаяць адказныя і цяжкія задачы.

Сутнасць іх заключаецца ў тым, каб на працягу першага паўгоддзя папоўніць веды, якія па многіх прычынах не былі ў школе засвоены, навучыць коратка і зразумела запісваць змест лекцый, пры гэтым не захапляцца дробязямі і не ўпускаць галоўнага, прывіць радасць самастойнага пазнання, навучыць правільна ацэньваць шляхі падыходу да рашэння матэматычных задач, дакладна вызначыць, які аб'ём ведаў можа засвоіць першакурснік з чытаемай лекцыі. Важна таксама ўсвядоміць, якую колькасць задач і практыкаванняў можна задаваць на дом, каб не адбіць жаданне і ахвоту займацца ў далейшым матэматыкай. Трэба ўзяць пад увагу і тыя абставіны, што першакурснікам выкладаюцца іншыя навукі, пры гэтым кожны выкладчык стараецца даць як мага больш інфармацыі аб сваім прадмеце.

Прыступаючы да чытання галоўнага курса і вядзення практычных заняткаў, я ўлічваў усе названыя абставіны. У пачатку навучальнага года на лекцыях указваў студэнтам: вось гэта трэба запісаць і падкрэсліць, а гэта можна апусціць. Доказы тэарэм і іншых задач праходзілі звычайным чынам, аднак у час лекцый часта звяртаўся да студэнтаў курса з пытаннямі па ходу разважанняў. Пытанні задаваў з мэтай напаміну папярэдніх параграфаў тэорыі ці для паўтарэння некаторых формул са школьнай матэматыкі. Адзначу наступнае: так называемая элементарная матэматыка — самая цяжкая з усіх раздзелаў матэматыкі. Усе, скончыўшыя сярэднія школы, ведаюць толькі палавіну з гэтай элементарнай матэматыкі.

Прымаючы пад увагу, што першакурснікі вучыліся ў розных настаўнікаў (з рознымі метадамі і прыёмамі навучання, спачатку я раблю ўводзіны ў агульны працэс вывучэння вышэйшай матэматыкі, з разуменнем агульнага метаду доказу тэарэм і задач. З першых лекцый слухачы ведаюць, што любая тэарэма даказваецца на аснове раней прынятых вызначэнняў ці даказаных тэарэм і несупярэчлівых вылічэнняў ці меркаванняў у працэсе вядзення гэтага доказу.

Увядзенне ў агульны працэс вывучэння патрабуе: індывідуальных гутарак з асобнымі студэнтамі па тэорыі школьнай матэматыкі, пастаяннага паўтарэння галоўных палажэнняў усюды, дзе гэта патрабуецца па асноўнаму чытаемаму курсу. І ўсё ж самае цяжкае — даць кароткія вывады правіл і доказы тэарэм школьнай матэматыкі, якія не былі растлумачаны настаўнікамі: дзяленне мнагачлена на мнагачлен, біном Ньютана, формулы адваротных трыганаметрычных функцый і іншыя правілы.

Практычныя заняткі праводзіліся непасрэдна па тых главах і параграфах, якія чыталіся на лекцыях. Разрываў у часе і паслядоўнасці выкладання тэорыі з практычнымі заняткамі не было. Далей, пры праверцы і ўліку ведаў студэнтаў браліся пад увагу наступныя абставіны. Які б ні быў студэнт, падрыхтаваны да практычных заняткаў ці не, перад выклікам выкладчыкам да дошкі ў яго ў гэты момант узнікае на некаторы час інстынктыўны страх, які ўскладняе мысленне і выражэнне меркавання ўголас. Тым не менш практычныя заняткі праходзілі на працягу ўсяго навучальнага 1975—1976 года без страху студэнтаў перад апытаннем іх і пачаткам рашэння задач. Дасягнута гэта было так. На практычных занятках па матэматыцы выклікаліся да дошкі (на працягу дзвюх вучэбных гадзін) не больш пяці-шасці чалавек, нават тыя, хто з месца рашуча адмаўляўся ісці да дошкі рашаць задачы. Адмовіўшыхся ісці да дошкі пасяброўску ўсё-такі прасіў падысці да яе са словамі: «Вы ідзіце да дошкі і раскажыце аб тым, што запомнілі на лекцыі, сваімі словамі. Калі ж што-небудзь забылі, мы ўсе, прысутнічаючыя тут, падкажам вам». Пасля такіх выклікаў нават не вельмі актыўныя студэнты, як правіла, да наступных заняткаў рыхтаваліся па тэорыі і выконвалі дамашнія заданні. Павінен заўважыць, калі выкліканы студэнт стаіць ля дошкі і нічога не адказвае, у гэты час у аўдыторыі лес паднятых рук — усе хочуць падказаць таварышу. Студэнт звычайна садзіцца на месца са словамі: «У апошні раз не падрыхтаваўся да заняткаў».

Звычайна пасля гэтага ў мяне ўстанаўліваюцца дзелавыя ўзаемаадносіны са студэнтамі. З моладдзю нельга хітрыць, ёй нельга патакаць, а яе трэба ведаць і накіроўваць. Дамашнія заданні выконваліся студэнтамі не за страх, а за сумленне. Гэта пацвердзіла шматгадовая практычная работа. Калі некаторыя мае калегі гавораць аб тым, што ёсць лянівыя і бяздарныя студэнты, то тут іх асабістая недапрацоўка ў метадзе выкладання і ва ўзаемаадносінах са студэнтамі.

Педагог павінен добра ведаць свой прадмет, быць майстрам сваёй справы, любіць сваю работу і сваю дысцыпліну, паважаць і любіць сваіх вучняў. Шчыра сцвярджаю, што калі адна з гэтых чатырох умоў не выканана, нават пры высокай навуковай ступені і званні педагога студэнцкая аўдыторыя адвернецца ад прадмета і выкладчыка. Асабісты вопыт пераканаў у тым, што непрыязнасць да педагога абавязкова пераносіцца на навуку, выкладаемую ім. Многімі адзначана: чым горш выкладчык вучыць, тым больш пытаецца на экзамене. І чым ён слабейшы як выхавацель, тым больш моцныя і крутыя меры прымяняе ў сваёй практыцы.

Выкладчыкі гэтага толку закідваюць дэканаты дакладнымі, пагражаюць студэнтам разлічыцца з імі на экзаменах. Гэта замест таго, каб вучыць моладзь словам і справай, выхоўваць у нармальнай абстаноўцы.

Мы не проста вучым моладзь асновам будучай прафесіі, мы выхоўваем людзей з нашымі камуністычнымі перакананнямі, якія пасля заканчэння універсітэта будуць кожны дзень выхоўваць і вучыць іншых.

Вядома, што ў акадэмічным патоку заўсёды ёсць некалькі непаспяваючых студэнтаў. У мінулым навучальным годзе яны былі прымацаваны да больш моцных па паспяховасці студэнтаў з тым, што моцным гэта будзе залічана як грамадская работа. Такія прымацаванні далі добрыя вынікі. Напрыклад, студэнты са слабай падрыхтоўкай В. Якуш і Т. Сівуха былі прымацаваны да добра падрыхтаваных студэнтаў А. Васільевай і Н. Бандарэнка. На працягу года студэнтка Т. Сівуха апярэдзіла моцных сваіх сяброўак. Яна паспяхова здала экзамен па матэматычнаму аналізу.

Асабліва важнае значэнне ў паспяховасці першакурснікаў мае сістэматычны кантроль за выкананнем дамашніх заданняў. Ён прывучае былых школьнікаў да сістэматычнай працы над прадметам.

**А. МАКСІМЕНКАЎ, старшы выкладчык механіка-матэматычнага факультэта.**

## У САРДЭЧНЫХ СЯБРОЎ




Дні польскай літаратуры, якія праходзілі ў нашай рэспубліцы, з'явіліся яркім сведчаннем непарушнай дружбы народаў, звязаных агульнасцю як у гісторыі фарміравання дзвюх нацый, так і ў гісторыі развіцця нацыянальных культур. Народ сённяшняй Польшчы паспяхова ідзе па шляху міру і сацыялізму. З попелу ўсталі разбураныя вайной гарады, радуе вока прыгажуня Варшава. Стара-Мяста — адзін з нямногіх раёнаў — сведкаў сямісотгадовай гісторыі польскай сталіцы.

**НА ЗДЫМКАХ:**
**ідзе пасяджэнне кангрэса;**
**Варшава, Палац навукі і культуры;**

**(Працяг на 2-й стар.).**



У адпаведнасці з Палажэннем аб аглядзе-конкурсе на лепшую навуковую работу сярод маладых вучоных БДУ імя У. І. Леніна ад 25 красавіка 1974 года для падвядзення вынікаў агляду-конкурсу па загаду рэктара ад 13 кастрычніка 1976 года створана камісія ў наступным саставе:

Л. Валадзько (старшыня) — прарэктар па навуковай рабоце, прафесар

Т. Пушкарова (намеснік старшыні) — старшыня савета маладых вучоных БДУ імя У. І. Леніна, кандыдат хімічных навук

Г. Давідзюк — загадчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў, прафесар

А. Тозік — сакратар камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна, кандыдат гістарычных навук

У. Ляхновіч — загадчык кафедры экалогіі і гідрабіялогіі і аховы прыроды, прафесар

І. Малевіч — загадчык лабараторыі НДІ ПФП, кандыдат тэхнічных навук

Г. Мядзведзеў — загадчык кафедры тэорыі верагоднасцей і матстатыстыкі, прафесар

Д. Мельцар — в. а. прафесара кафедры гісторыі БССР, доктар гістарычных навук

Я. Сарцэўскі — загадчык кафедры агульнай фізікі, прафесар

Б. Стральцоў — загадчык кафедры тэорыі і практыкі журналістыкі, прафесар

А. Супрун — загадчык кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства, прафесар

Г. Старобінец — загадчык кафедры аналітычнай хіміі, прафесар

А. Фядзенка — дэкан механіка-матэматычнага факультэта, прафесар

В. Чыгір — дэкан юрыдычнага факультэта, прафесар

В. Якушка—загадчыца кафедры агульнага землязнаўства, прафесар.



Студэнты III курса хімфака дапамагалі сёлета ўбіраць бульбу працаўнікам калгаса «Чырвоны сцяг» Клімавіцкага раёна. Уборка вялася механізаваным спосабам.

Гэты здымак зроблен перад выездам у поле.

Фота В. БЫЧКОВА.

# СТУДЭНТЫ — КАЛГАСУ

Зварот камсамольцаў атрада «Праметэй» (II курс геаграфічнага факультэта) да ўсіх байцоў студэнцкіх атрадаў, якія працавалі на ўборцы бульбы на палетках калгасаў і саўгасаў Талачынскага раёна, знайшоў гарачы водгук у студэнтаў філалагічнага факультэта. З першых дзён работы ўзяў добры тэмп атрад «Ветразь» (III курс, аддзяленне беларускай мовы і літаратуры). Дзяржаўны падыход да справы, энтузіязм, арганізацыя сацыялістычнага спаборніцтва — гэта адметныя рысы атрада. Камсамольцы выступілі з канцэртам перад жыхарамі калгаса імя Георгія Дзімітрова. Працягваючы лепшыя традыцыі савецкага студэнцтва, дзяўчаты дапамагалі ветэранам вайны і працы, пенсіянерам, наведалі школу ў в. Забалоцце, расказалі выпускнікам пра універсітэт і свой факультэт.

Праўленне калгаса, дзе працавалі студэнты, узнагародзіла каштоўнымі падарункамі пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва — Таню Гурыновіч, Ніну Дзмітрук, Валю Савіцкую, Зою Міклуш, Аню Варанецкую, Марыю Аношка.

Т. АЛЯКСАНДРАВА.

# ПРАЦАВАЛІ З НАТХНЕННЕМ

Як заўсёды, з прыходам восені прыходзяць і новыя турботы да работнікаў сельскай гаспадаркі: трэба як мага хутчэй сабраць з палеткаў увесь ураджай. Як заўсёды, на дапамогу калгаснікам прыйшлі студэнты.

Добра зарэкамендавалі сябе другакурснікі факультэта журналістыкі, якія працавалі ў калгасе «XVII партз'езд» Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці. Трэба адзначыць зладжаны рытм, добрую арганізацыю працы ў студэнтаў. Немалаважную ролю ў гэтым адыграла паспяховае кіраўніцтва студэнцкім атрадам з боку Аляксандра Уліцёнка (камандзір), Ніны Валасюк (камісар), Яўгена Дуброўскага і Пятра Трубчыка (камандзіры груп). Яны заўсёды былі наперадзе. У ходзе сацыялістычнага спаборніцтва вызначыліся пераможцы — студэнты 1-й і 3-й груп.

За месяц працы была ўбрана бульба з плошчы 96 га, 1600 т бульбы выбрана. І яшчэ такія лічбы: пры норме выпрацоўкі 640 кг на чалавека студэнты ўбіралі да 900 кг. Часта бывалі дні, калі норма перавыконвалася ўдвая.

Акрамя ўборкі бульбы, другакурснікі дапамагалі ўбіраць лён, салому, аказалі значную дапамогу ў вытворчасці вітаміннай мукі, у нарыхтоўцы сенажу, сіласу і г. д. Калі патрэбна была тэрміновая дапамога, працавалі і ў выхадныя дні. Якой бы ні была работа, усюды адчуваўся задор маладосці.

Не раз адзначалі кіраўнікі і спецыялісты гаспадаркі выдатную працу студэнтаў. Так, 7 кастрычніка на цэнтральнай сядзібе калгаса быў узнят сцяг працоўнай славы ў гонар ударнай працы студэнтаў 3-й групы. У гэты дзень кожным было сабрана па 1810 кг клубняў—амаль у тры разы больш нормы! Ганаровымі граматамі і прэміямі былі ўзнагароджаны 26 чалавек. Аб працы студэнтаў у калгасе «XVII партз'езд» расказвалася на старонках райгазеты і рэспубліканскай прэсы.

Да Дня работніка сельскай гаспадаркі студэнты падрыхтавалі вялікі канцэрт мастацкай самадзейнасці. Не раз яны праводзілі палітінфармацыі, гутаркі сярод калгаснікаў, прачыталі 7 дакладаў, рэгулярна выпускалі насценную газету. Штодзённа выходзіла «Маланка», дзе падводзіліся вынікі працоўнага дня... Добрым словам успамінаюць калгаснікі сваіх памочнікаў.

Т. ПЕТРАШКЕВІЧ.

# У САРДЭЧНЫХ СЯБРОЎ



(Працяг. Пачатак на 1-й стар.).

Цёпла сустракаюць польскія працоўныя ўдзельнікаў розных міжнародных форумаў, спартыўных спаборніцтваў. Нядаўна Варшава гасцінна прымала ўдзельнікаў III Кангрэса Міжнароднай асацыяцыі выкладчыкаў рускай мовы і літаратуры. Кангрэс праходзіў у Варшаўскім палацы навукі і культуры. Удзельнікамі яго былі выкладчыкі нашага універсітэта, іншых ВНУ і школ Мінска.

У. БУДАЙ.



НА ЗДЫМКАХ:

Тэатральная плошча сталіцы — любімае месца варшавян;

мінчане ў Варшаве.

Фота аўтара.

# КУЛЬТУРНАЯ ХРОНІКА

У лістападзе ў г. Горкім адбудзецца фестываль палітычнай песні. На яго з едзецца моладзь з усёй краіны. У якасці ганаровых гасцей на фестываль запрошаны прадстаўнікі нашага універсітэта. Сваё майстэрства ў Горкім пакажуць салісты вакальна-інструментальнага ансамбля філалагічнага факультэта БДУ.

* * *

У хуткім часе нас чакае сустрэча з фальклорна-этнаграфічным ансамблем «Славянкі» з Ягелонскага універсітэта (Кракаў). Гэта візіт у адказ на паездку народнага ансамбля народных інструментаў БДУ у Польшчу у мінулым годзе.

* * *

Клуб любіцеляў паэзіі толькі-толькі нарадзіўся. Пры ім створана студыя мастацкага слова. Студэнты БДУ маюць магчымасць стаць актыўнымі ўдзельнікамі пасяджэнняў клуба. Кіруе ім старшыня праўлення клуба універсітэта Дзіна Тыцюк.

* * *

На дэманстрацыі ў гонар 59-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі мы упершыню ўбачым і пачуем духавы аркестр універсітэта, створаны студэнтамі юрыдычнага факультэта М. і А. Кручэнкамі.

* * *

У панядзелак, 17 кастрычніка, адбылося адкрыццё новага Дома літаратараў. У святочным канцэрце з поспехам выступіў студэнцкі тэатр мініяцюр факультэта журналістыкі.

С. МІКАЛАЕВА.

# АРЫЕНТАЦЫЯ НА ПРАФЕСІЮ

На XVIII пленуме ЦК КПБ першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі П. М. Машэраў падкрэсліў, што наша агульнаадукацыйная школа займае асобае месца ў сістэме навучання і выхавання падрастаючага пакалення, фарміравання яго высокіх палітычных, ідэйна-маральных і інтэлектуальна - разумовых якасцей. Працэс акселерацыі ўцягнуў у сваю арбіту і нашу школу: з першых год вучобы сённяшнія школьнікі валодаюць значна большым запасам ведаў, чым іх равеснікі 10—15 гадоў назад. У вялікай ступені ўсё гэта датычыцца і пытанняў прафесійнай арыентацыі.

Не першы год працуюць на ніве прафарыентацыі і камсамольцы нашага універсітэта. У 35 сельскіх і гарадскіх школах частымі гасцямі былі студэнты буйнейшай навучальнай установы рэспублікі. Галоўнай формай работы, традыцыйна, з'яўляецца ў нас вусны расказ. Першае знаёмства шэфаў са старшакласнікамі пачынаецца з расказаў аб універсітэце і факультэтах, прафесіях, якія можна атрымаць у сценах БДУ. Большасць нашых падшэфных не адзін раз наведвалі і сам універсітэт. Спецыяльна для іх у нас штогод праводзяцца дні адкрытых дзвярэй на факультэтах, дзе перад выпускнікамі выступаюць вядучыя вучоныя і выкладчыкі, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. У гэтыя дні кожная аўдыторыя, кабінет, лабараторыя гасцінна адкрывае дзверы для школьнікаў. Да сказанага неабходна дадаць і тое, што кожны студэнт універсітэта ў час зімовых канікулаў выступае з лекцыямі аб БДУ ў школах па месцу жыхарства на вечарах-сустрэчах з выпускнікамі школ.

У час летніх канікулаў справу прафарыентацыі працягваюць байцы студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Толькі ў гэтым годзе імі прачытана і праведзена больш як 120 лекцый і гутарак з выпускнікамі сярэдніх школ Мінскай вобласці. Будаўнічы атрад «Буравеснік-76» імя В. І. Казлова філалагічнага факультэта аформіў і вывесіў у буйнейшых населеных пунктах Кастрычніцкага раёна Гомельскай вобласці спецыяльныя стэнды-запрашэнні на вучобу ў БДУ.

Важнейшай састаўной часткай работы з выпускнікамі з'яўляюцца школы юных, у якіх займаюцца пераважна вучні 9—10 класаў г. Мінска і Мінскага раёна. За мінулую пяцігодку падрыхтоўку ў гэтых школах прайшло больш як 1530 школьнікаў. У дзесятай пяцігодцы ва універсітэце пачалі працаваць школы юных праграмістаў, гісторыкаў. Аб папулярнасці гэтых школ сведчыць той факт, што сёлета, напрыклад, у школу «Юны фізік» замест плануемых 90 чалавек падало заявы больш двухсот. Тое ж можна сказаць і аб школах юных хімікаў, біёлагаў, матэматыкаў. Не можа не радаваць нас той факт, што ўсё больш выпускнікоў школ юных становіцца студэнтамі нашага універсітэта.

Мяркуем мы ў новай пяцігодцы прыцягваць да ўдзелу ў факультэцкіх навуковых студэнцкіх гуртках старшакласнікаў сельскіх сярэдніх школ. Гэтая форма работы нядрэнна зарэкамендавала сябе ў некаторых вышэйшых навучальных установах Масквы і Кіева, дзе выпускнікамі універсітэтаў і інстытутаў у сельскай мясцовасці стварaліся карэспандэнцкія пункты фальклорнага, дыялекталагічнага гурткоў, гуртка гісторыі роднага краю. Старшакласнікі пад кіраўніцтвам выкладчыкаў збіралі фактычны матэрыял, апрацоўвалі яго, а потым сустракаліся на сумесных пасяджэннях са студэнтамі і абмяркоўвалі вынікі работы. Думаецца, што практыку такой дзейнасці добра было б распаўсюдзіць і на работу некаторых кафедр нашага універсітэта.

Вялікія магчымасці тояцца ў нашым супрацоўніцтве з гарадскімі прафесійна-тэхнічнымі вучылішчамі. Сумесныя вечары-сустрэчы ў падшэфных школах, лекцыі і гутаркі істотна дапоўнілі б агульную карціну нашых намаганняў па прафесійнай арыентацыі, дапамаглі б правільнаму выбару будучай прафесіі. Таму ўжо ў гэтым годзе факультэцкімі камсамольскімі арганізацыямі плануюцца сумесныя выезды агітбрыгад, лектараў БДУ і вучылішчаў у сельскія падшэфныя школы. А летам у нашых падшэфных Стаўбцоўскім, Дзяржынскім і Клецкім раёнах Мінскай вобласці будуць працаваць будаўнічыя атрады, працаваць поруч з тымі, хто ў хуткім часе папоўніць армію студэнтаў і навучэнцаў прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, хто з новымі ведамі прыйдзе ў дружную сям'ю рабочых і калгаснікаў, савецкай інтэлігенцыі.

М. ПРЫГОДЗІЧ, член бюро камітэта камсамола БДУ.

# ПАСПЯХОВЫЯ ГАСТРОЛІ

**Завяршылася працягваўшаяся 12 дзён гастрольная паездка па Аўстрыі самадзейнага студэнцкага ансамбля Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна «Крыжачок», арганізаваная Беларускім таварыствам дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі сумесна з Аўстра-Савецкім таварыствам. Выступленні студэнцкага ансамбля сталі адным з галоўных мерапрыемстваў Дзён Беларускай ССР на зямлі Ніжняя Аўстрыя.**

**Наш ансамбль, расказаў у гутарцы з карэспандэнтам ТАСС яго мастацкі кіраўнік, заслужаны дзеяч культуры БССР Н. В. Лапша, упершыню знаходзіўся ў Аўстрыі. За гэтыя дні намі былі пастаўлены 8 канцэртаў у гарадах Крэмсе, Віне-Нейштаце, Санкт-Пельцэне, Карнойбурзе, Лінце і Вене. Усе выступленні праходзілі з вялікім поспехам, пры перапоўненых залах. Публіка цёпла прымала танцавальныя нумары — беларускі «Крыжачок», рускую «Барыню», украінскі «Гапак».**

**Аб сяброўскай атмасферы, у якой праходзілі гастролі, расказаў і кіраўнік групы, загадчык аддзела Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі Г. В. Юшкевіч. У Санкт-Пельцэне, сказаў ён, мы выступалі разам з хорам аўстрыйскіх чыгуначнікаў, вядомым у краіне самадзейным калектывам. Гэты канцэрт выліўся ў пераканаўчую дэманстрацыю сяброўства.**

**Мы перакананы, адзначыў у заключэнне Г. В. Юшкевіч, што наша паездка ў Аўстрыю садзейнічала ўмацаванню ўзаемаразумення і сяброўства паміж народамі СССР і Аўстрыі.**

Л. ВАЛНУХІН. (ТАСС).




ЛІРЫЧНЫЯ МІНІЯЦЮРЫ.

## ЖЫВЫЯ ФЛЮГЕРЫ

Ніколі, нават у малы вецер, не бачыў, каб села птушка бокам да яго — толькі галавою. Калі вецер дзьме з поўначы — усе птушкі, якія адпачываюць, глядзяць на поўнач, а калі з поўдня — на поўдзень

Ну, чым не флюгеры?

## ЦЁПЛЫ ДЗЕНЬ

У кастрычніку ж, бывае, разальецца ўсяго на некалькі дзянькоў амаль летняя цяплынь, і здаецца, што слата была непаразуменнем, такое ласкавае сонца, так утульна на палянах. Паўраздзетыя дрэвы заміраюць у ціхім роздуме: скідаць рэшткі лісцяў ці пачакаць?

У адзін з такіх дзён, гарачых к поўдню, пачынаюць выпаўзаць са сваіх нор жаўтаротыя вужы: тонкія, узорыстыя.

Ідзе чалавек, убачыць вужа, прыпыніцца: змяя! Хто ведае, адразу вызначыць —вуж, пераступіць, абыйдзе бокам, няхай грэецца. Іншы шукае палку, а потым выхваляецца: «Гадзюку забіў!»

К вечару вужы зноў распаўзаюцца па норах. Чаго гэта яны? Мабыць, перш чым заснуць на зіму, павінны выканаць нейкі свой старажытны звычай, аб якім мы не ведаем?

Або проста вужоў падмануў цёплы кастрычніцкі дзень?

## ВОБЛАКІ ПАД НАГАМІ

Восенню асабліва востра адчуваеш, як спяшаецца час, і кожны ўпаўшы на зямлю ліст— быццам стук ціхага маятніка. І міжволі ў сэрца закрадваецца лёгкі сум.

Але самае незвычайнае восенню — лясныя лужыны. Вада ў іх чыстая, спакойная, як прамытае шкло. Падыйдзеш да якой-небудзь з іх, прыпынішся ля краю, страшнавата пераступіць: воблака пад нагамі!

**В. ХЛІМАНАЎ.**

# У ТАЯМНІЦАХ ЭКАЛОГІІ

**Наш няштатны карэспандэнт В. Мартыненка ўзяў інтэрв'ю ў загадчыка кафедры экалогіі, агульнай гідрабіялогіі і аховы прыроды У. П. Ляхновіча.**

**— Якія асноўныя напрамкі работы вашай кафедры!**

— Кафедра мае дзве спецыялізацыі: гідрабіялогія і ахова прыроды. Яны аб'яднаны на адной кафедры таму, што ў сваёй аснове маюць агульную экалогію, г. зн. навуку, якая звязвае разам усе працэсы і ўзаемадзеянні жывых арганізмаў паміж сабой, а таксама з акружаючым іх нежывым асяроддзем.

Па ахове прыроды (як і па гідрабіялогіі) студэнты пачынаюць спецыялізавацца на III курсе пасля праходжання агульнабіялагічнай падрыхтоўкі. Ахова прыроды ўключае ў сябе многія цікавыя тэмы — навуковыя асновы паляўнічай і рыбнай гаспадаркі, запаведнікі і нацыянальныя паркі свету як спосаб аховы прыроды, біясферу і г. д. Асвятляюцца прававыя нормы аховы, прынятыя ў Савецкім Саюзе і іншых перадавых дзяржавах. Вучэбная і вытворчая практыкі студэнтаў заключаюцца ва ўдзеле іх у экспедыцыях, навукова-даследчай рабоце. Пасля спецыялізацыі студэнтам прадастаўляецца работа ў запаведніках, у сістэме Дзяржкамітэта па ахове прыроды.

Студэнты, якія спецыялізуюцца па гідрабіялогіі, вывучаюць экалагічныя фактары воднага асяроддзя, санітарна-тэхнічную гідрабіялогію, біяэнергетыку водных экасістэм, экалогію рыб... Пасля заканчэння ВНУ яны працуюць ва ўстановах гідрабіялагічнага і рыбагаспадарчага профілю, выкладчыкамі хіміі і біялогіі ў школах.

**— Вы сказалі, што студэнты вядуць навукова-даследчую работу. Назавіце лепшыя працы!**

— Кожны год мы прадстаўляем на рэспубліканскі конкурс навуковых работ 7—10 студэнцкіх прац. У мінулым годзе па выніках конкурсу чатыры працы былі аднесены да першай катэгорыі, столькі ж—да другой, а праца Г. Цішчыкава «Біялогія малюска дрэйсена» атрымала першую прэмію.

На кафедры працуе СНДЛ, студэнцкі навуковы гурток, дружына грамадскіх інспектараў аховы прыроды. Студэнты выязджаюць у прыгарадную зону, праводзяць доследы. Па выніках гэтай работы ў мінулым годзе шэсць чалавек атрымалі грашовую прэмію райвыканкома. Насельніцтва абслугоўвае лектарская група студэнтаў. Яна арганізавала кінолекторый «У свеце прыроды» для школьнікаў.

**— Мы ведаем, што кафедра падтрымлівае сувязі з вядучымі вучонымі свету...**

— Так. Нядаўна да нас прыязджаў вядомы амерыканскі эколаг Е. Одум. У СССР яго ведаюць па кнігах «Экалогія» і «Асновы экалогіі», дзе сабраны навейшыя звесткі па ўсіх раздзелах гэтай навукі. На кафедру прыязджаюць таксама вучоныя з Польшчы, ГДР, Чэхаславакіі і іншых краін.

У вучобе студэнтам дапамагаюць кнігі, якія выдае кафедра. А такая навуковая праца, як «Метады вызначэння прадукцыі водных жывёлін», пераведзена на англійскую мову, і ёю карыстаюцца многія замежныя вучоныя.

Спецыялісты па ахове прыроды павінны быць людзьмі адукаванымі, настойлівымі і ўпартымі. Іх прафесія сёння мае першаступеннае значэнне.



Старонку клуба любіцеляў прыроды падрыхтавала **С. ШЫДЛОЎСКАЯ.**

**В. АРЦЁМАЎ**

Заломала ива  
С дрожью руки-ветви.  
В пене бьется озеро,  
Озеру тесно.  
А птенцов у иволги  
Разметало ветром,  
А гнездо у иволги  
Ветром унесло.  
Ветер не заметил,  
Ветер веселится,  
А у ней, у маленькой,  
Чем измерить боль?  
Как же мог я думать,  
Что поют нам птицы,  
Что поют нам птицы  
Только про любовь!?

# ПРЫЗНАННЕ

**Па-мойму, кожны чалавек — паэт,  
Калі цяплом Радзімы ён сагрэты.**

**М. МІНЧАНКА.**

Вось і восень. Раніцай імжыць дождж, сее тугу аб леце, леце-песні, леце-свяце. Я бягу са студэнцкай сумкай да аўтобуснага прыпынку. Дождж, дождж... На мокрым асфальце—жоўтае лісце. І сэрца сціскаецца ад незразумелага жалю: толькі восенню чамусьці мы звяртаем свой позірк назад, на пражытыя дні. Мне здаецца, што восенню мы сталеем.

Кладу на далонь жоўтае полымя лістка і быццам адчуваю яго подых. Гэты лісток увабраў у сябе сонечнае цяпло, усю гаму пахаў лета, ён купаўся ў духмяных росах, давяраў свае тайны гарэзе-ветрыку. А цяпер ляжыць у маёй руцэ. Другі яго сабрат—бярозавы лісток з маёй радзімы — ляжыць у блакноце. Кожны раз, калі адкрываю блакнот, бяру лісток, прыпадаю да яго тварам. Здаецца, ён цёплы. Я адчуваю цеплыню бярозы, якую пасадзіла дзесяць гадоў назад, цеплыню маёй вёскі...

**Т. МАНЁНАК.**

# ЛЯСНАЯ ПЕСНЯ

...Я стаю на лясной паляне і слухаю лясную песню. Таямнічая, чароўная, непаўторная, яна заварожвае, напаўняе сэрца невядомым, але да болю прыемным пачуццём. Міжволі стаіш і прымаеш гэты лясны дар.

Вось, напэўна, нехта на жалейцы грае. Гэта гудзяць на вятры стройныя клёны.

Бярозы вельмі прывабныя, бо дуб завіхаецца каля іх, як хлопец каля дзяўчат. То адной, то другой пашэпча на вуха. Але дзесь недалёка затрапяталіся раўнівыя суседкі-асінкі.

А навокал хвоі, хвоі, хвоі. Яны, як стражнікі, ахоўваюць лясную цішыню. Але ж хіба ўгледзіш за ўсімі! Заспрачаліся паміж сабою варона з сарокаю. З галінкі на галінку, абтрасаючы ігліцу, скачуць непаседлівыя сойкі. Чуецца стук дзятла-кузняца.

— У-у-у, — падала свой голас старая ласіха. Гора ёй, удаве: не прыйдзе болей сябар, бо спаткаўся з самым злосным лясным ворагам — паляўнічым - браканьерам.

Стаю, як заварожаны. Думаю, чым жа дапамагчы бядачцы. Заяц, выскачыўшы невядома адкуль, спалохаў ласіху і спалохаўся сам, бо даў такога стракача, што і куля не дагоніць.

Доўгая лясная песня. Няма ёй канца і не будзе ніколі. Бо песня гэта — вечны дар прыроды.

**Т. ЧАРНАВУС.**

# МЕДЗЬКА

БЫЛЬ

Быў у мяне сябар, верны, самаадданы. Вы, магчыма, не паверыце, але гэта быў кот. Ярка-рыжага колеру, з белым «гальштукам», у белых «ботах». Назвала я яго Медзькай.

А трапіў ён да мяне выпадкова. Аднойчы суседка, ведаючы, што я люблю жывёл, прапанавала мне чорна-белае кацяня. Я згадзілася. Але прынесла яна мне не чорна-белага, а рыжага-рыжага, нібы агонь. Адмаўляцца я не стала, хоць крыху расчаравалася.

— Ну, рыжы коцік,—сказала я яму,—назаву цябе Медзькай.

З гэтай самай мінуты мы з ім пасябравалі. За кароткі час ён цудоўна вывучыў усе дамашнія парадкі і педантычна стараўся выконваць іх. Правініўся — не хаваецца, а лашчыцца каля ног, нібы просячы прабачэння. Не хапала духу яго лаяць.

Кот аказаўся вельмі разумны. Так, ён лічыў, відаць, сваім кроўным абавязкам праводзіць мяне за вадою, за дровамі і г. д. І мне весялей, і яму таксама.

Медзька выдатна ведаў сваіх і чужых. Гавораць, што на гэта здольны толькі сабакі. Відаць, не толькі. Калі ў доме хто-небудзь чужы, убачыўшы важнага рыжага ката, які клубочкам скруціўся на стуле, хацеў яго пагладзіць, «клубочак» выпускаў свае вострыя кіпці і пагражальна шыпеў. Незадачліваму госцю даводзілася хутка хаваць руку, каб кот не пакінуў на ёй свой «аўтограф».

А вечарам, калі ў вокны ламаўся пранізлівы восеньскі вецер, кроплі дажджу паўзлі па шклу ці сыпаў бясконцы белы снег, мы садзіліся з ім перад ярка гарэўшаю печкаю. Весела патрэсквала паленне, рассыпаючы іскры. Медзька, утульна прымайстраваўшыся ў мяне на каленях, варкатаў — «расказваў» мне казкі адну даўжэйшую за другую. Яго вельмі цікавіла гэтая рыжая, танцуючая без стомы істота — агонь. Ён часта, прыжмурыўшыся, глядзеў у печку доўга і неадрыўна. Так і глядзі, туды скокне. Але не, асцярожнасць ніколі не здраджвала яму.

Калі я наведвала вячэрнюю школу, ён спрабаваў праводзіць мяне і туды. Але гэта было далёка, кот палохаўся машын (усё ж гэта не сабака!) і з палавіны шляху знікаў у якой-небудзь дзірцы. Затое вечарам — я гэта цвёрда ведала — ён будзе абавязкова чакаць мяне каля дому ў любое надвор'е. І мы разам зойдзем у цёплы пакой. Яго самаадданасць і вернасць не ведалі меж. І аднойчы яны праявіліся вельмі ярка.

Неяк, злавіўшы мыш і задушыўшы яе, кот прыбег, вельмі задаволены сабою. Убачыўшы мяне, зараз жа палажыў гэтую мыш мне пад ногі. Ускрыкнуўшы, я пабегла ў іншы пакой. Медзька чакаў падзякі — доўга стаяў перад дзвярыма з мышкай у зубах.

Здаралася, я варыла на кухні абед, а ён сядзеў на акне і аддана сачыў за маімі рухамі круглымі зялёнымі вачыма. Тады я частавала яго свежаю капустаю ці шчаўем, зусім не з «каціная меню». І мой бедны сябар еў гэтыя «вітаміны», таму што ён не жадаў мне ні ў чым адмаўляць.

Але аднойчы выпадак палажыў канец нашаму сяброўству. Пасля моцнага ветру мы гулялі з братам па скверыку і знайшлі выкінутага з гнязда маленькага верабейку. Мы падабралі яго, прынеслі дадому, абагрэлі, накармілі. Верабейка ўзмацнеў, стаў зноў пушыстым шэрым шарыкам. У доме знайшлася клетка для птушак, куды мы яго і пасадзілі. Некаторы час усё было ў парадку: верабейка скакаў па клетцы, а Медзька хітра пазіраў на яго зялёнымі вачыма. Я зусім супакоілася за жыццё птушкі.

І дарэмна. Неяк я паставіла клетку на падлогу і стала карміць вераб'я. І ў гэты момант у пакой непрыкметна прыбег Медзька. Не паспела я і вокам міргнуць, як ён, прасунуўшы лапу цераз пруткі, прыдавіў вераб'я да падлогі. Ад нечаканасці я і крыкнуць не паспела, толькі стукнула яго па спіне і адштурхнула ад клеткі. Але было позна—верабей ляжаў нерухома... А кот знік.

Пазней я, засумаваўшы па Медзьку, пайшла яго шукаць і не знайшла. Не прыйшоў ён дадому і вечарам, і на другі дзень. Не было яго і на трэці дзень. Кот знік. Знік, так і не прабачыўшы мне нанесенай яму крыўды...

Можа вы дзе-небудзь бачылі ката, рыжага-рыжага, з белым «гальштукам» і ў белых «ботах»?

**Т. ВОЛКАВА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**



Журба. Фота **Т. Волкавай.**

